№77 (1890)

Аўторак, 4 мая 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец УП «Народная воля».

Кошт свабодны.

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +19...+21, уначы — +12...+14; у Брэсце ўдзень — +20...+22, уначы — +14...+16; у Гродне ўдзень — +19...+21, уначы — +13...+15; у Віцебску ўдзень — +19...+21, уначы — +11...+13; у Гомелі ўдзень — +20...+22, уначы — +11...+13; у Магілёве ўдзень — +21...+23, дождж, уначы — +11...+13.
На ўсёй тэрыторыі краіны захаваецца цёплае, без ападкаў надвор'е.

www.meteo.by

Жыллёва-камунальныя паслугі зноў падаражэюць

Да канца 2004 года насельніцтва Беларусі будзе аплачваць не больш за 60 працэнтаў ад сабекошту жыллёва-камунальных расходаў. Аб гэтым, выступаючы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, заявіў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Валерый Новак.

Паводле яго слоў, да канца года цэны на паслугі ЖКГ вырастуць не больш як на 5—7 долараў ЗША. "Вышэй мы проста падняць не зможам, таму што насельніцтва не зможа аплачваць нашы паслугі", — сказаў В.Новак.

Юрый ПАЦЭМКІН.

Рэдакцыі газеты «Народная воля»

Паважаная рэдакцыя! Дзякую за надрукаванне віншавання.

Прашу перадаць праз газету маю ўдзячнасць і добрыя зычанні ўсім тым, хто пісаў і віншаваў мяне з 60-годдзем.

Жыве Беларусь!

Зянон ПАЗЬНЯК.

Варшава.


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Рыгор ВАСІЛЕВІЧ:

«Некаторыя акадэмікі ператварылі агульны сход у палітычную баявую арэну, пераблытаўшы яго з палітычнымі партыямі, у якіх працуюць...»

У мінулым нумары "Народнай волі" прайшла інфармацыя аб тым, як некаторыя вядомыя асобы краіны не змаглі трапіць у члены-карэспандэнты альбо акадэмікі Нацыянальнай акадэміі Беларусі.

Сваю няўдалую спробу стаць членам-карэспандэнтам Акадэміі навук старшыня Канстытуцыйнага суда Беларусі Рыгор Васілевіч звязвае з палітыкай. Пра гэта ён сказаў, адказваючы на пытанне журналіста "Народнай волі".



— Рыгор Аляксеевіч, нядаўна Вы спрабавалі стаць членам-карэспандэнтам Акадэміі навук і з трэскам праваліліся. Вакол гэтай справы ходзіць шмат чутак. Як Вы самі можаце пракаменціраваць усё гэта?

— На агульным сходзе за маё выбранне прагаласавалі 105 чалавек, не хапіла 11 галасоў. На жаль...

Я напісаў 53 кнігі і 14 падручнікаў, з якіх 23 кнігі і 4 падручнікі самастойна. У іх склад увайшло больш за 500 навуковых артыкулаў, што змяшчаюць тыя думкі і ідэі, рэалізацыя якіх дазволіла б паскорыць прававое, дэмакратычнае і сацыяльнае станаўленне нашай дзяржавы. Я лічу, што кандыдат у члены-карэспандэнты Васілевіч, які мае ў два, а то і ў тры разы болей навуковых публікацый, чым некаторыя з шэрагу абраных (а рашэнне прымаецца менавіта па навуковых работах), зрабіў усё, каб стаць годным на гэтае званне. Усё прадстаўленае — вынік маёй працы, а не выпадак, калі кіраўнік чытае даклады, напісаныя за яго падначаленымі. Так, я не маю вучонай ступені доктара навук. Але я лічу, што некаторыя акадэмікі ператварылі агульны сход у палітычную баявую арэну, пераблытаўшы яго з палітычнымі партыямі, у якіх працуюць. І тыя, хто зрабіў усё дзеля таго, каб у навуковае роддзе не быў запушчаны чалавек, здольны садзейнічаць удасканаленню заканадаўства, і ў лік акадэмікаў не трапіў, зрабілі памылку.

На агульным сходзе аддзялення гуманітарных навук у першым туры я атрымаў 20 галасоў, пры тым што абавязкова патрабавалася 18. Па гэтым аддзяленні праходзіла 25 чалавек, у другі тур дапушчаны былі толькі трое. Але я лічу, што многія з тых, хто не прайшоў на аддзяленні, адназначна заслугоўвалі падтрымкі. На жаль, не ўдалося іх атрымаць... Далей наш лёс вырашаўся прадстаўнікамі прыродазнаўчых і дакладных навук. Але яны, мяркую, маіх работ не ведаюць...

— Ну а банкет, пра які ў "Народнай волі" напісаў Вячаслаў Оргіш, усё ж такі быў заказаны ці не?

— Банкет не быў заказаны. Магчыма, напісаўшы хлусню, спадар Оргіш сам адпрацоўвае чыйсьці банкет? Яго здрадствам прасякнута ўся тая заметка. Дрэнна, калі матэрыялы пішуць па прынцыпе "замяшаць крыху праўды на хлусні"...

— Вы адказалі на пытанні, якія тычацца асабіста Вас. Карыстаючыся выпадкам, дазвольце я задам яшчэ пытанне агульнадзяржаўнага значэння?

— Калі ласка...

— Чакаецца, што ў хуткім часе некаторыя грамадскія арганізацыі звернуцца ў Канстытуцыйны суд са скаргай на грубае парушэнне артыкула аб дзяржаўных мовах на Беларускім тэлебачанні. Якім, на Вашу думку, можа стаць прысуд?

— Павінен сказаць, што Канстытуцыйны суд робіць усё дзеля таго, каб канстытуцыйныя палажэнні аб дзяржаўнасці дзвюх моў на Беларусі не былі парушаны. І пэўным нашым крокам у гэтым кірунку стала тое, што менавіта па ініцыятыве Канстытуцыйнага суда за парушэнне заканадаўства аб дзяржаўнай мове прадугледжана адміністрацыйнае пакаранне. Звярнуцца са скаргай да нас могуць усе пералічаныя ў частцы 4 артыкула 116 арганізацыі і звычайныя грамадзяне. Пасля таго як суд высветліць, ці мае гэтая скарга рацыю, ён і прыме адпаведнае рашэнне. Самі мы, дарэчы, усе свае матэрыялы і дакументы выпускаем на дзвюх мовах: рускай і беларускай.

Пытанні задавала Марыя РУСАКОВІЧ.

ЭКСКЛЮЗИВ

«Ведь если мы желаем войти в клуб, мы обязаны соблюдать правила, установленные для всех его членов...»

На вопросы «Народной воли» отвечает Чрезвычайный и Полномочный Посол Французской Республики в Республике Беларусь ***Стефан ШМЕЛЕВСКИЙ***

— Г-н Посол, с 1 мая единая европейская семья приросла еще десятью государствами. Среди них и три страны, которые имеют общую границу с Беларусью. Это — Латвия, Литва и Польша. Как, на Ваш взгляд, могут измениться отношения между Беларусью и Евросоюзом после его расширения?

— Я уже говорил на Минском форуме, что в связи с расширением Европы Беларусь будет иметь общую границу с тремя странами ЕС протяженностью 1200 километров. И Европа пытается справиться с этой ситуацией, рассматривать ее с точки зрения новой политики в отношении своих новых соседей. Именно от Беларуси зависит, желает ли она активно участвовать в новой политике и завязать с Европой новый тип отношений. И, похоже, такое желание существует, поскольку, если мне не изменяет память, в декабре президент Лукашенко дал задание Министерству иностранных дел улучшить отношения с Европой. Это намерение было еще раз подтверждено им в обращении к белорусскому Национальному собранию. Но в то же время мы наблюдаем, что ряд событий, которые произошли с того времени в Беларуси, не соответствуют данному намерению. И это остается для Евросоюза открытым вопросом.

— Всего месяцем раньше расширило свои рамки и НАТО. Можно ли найти в этих процессах схожесть? Есть ли здесь какая-то прямая зависимость?

— В принципе, это два разных, отдельных процесса. Но определенная связь между ними существует. Если НАТО расширяется параллельно, в одно и то же время с Евросоюзом, то это происходит, вероятно, потому, что у Евросоюза нет своей военной структуры, которую можно было бы сравнить с НАТО. Но Европа прилагает все больше усилий для разработки военных структур, поскольку ей необходим определенный военный механизм. Можно предположить, что когда у Европы такой механизм появится, у европейцев будет меньше необходимости обращаться к НАТО. Но даже и тогда, безо всякого сомнения, будет существовать политическая необходимость альянса, соединяющего два берега Атлантики, которые разделяют одинаковые демократические ценности. Но это вопрос не ближайшего будущего.

— Г-н Посол, многим жителям Беларуси, особенно старшего поколения, НАТО представляется эдаким монстром, который все ближе приближается к границе Беларуси. Еще один шажок — и он захватит Беларусь. Как, по Вашему мнению, может отразиться на судьбе Беларуси, на ее безопасности новое расширение НАТО? Теперь у нашей страны будет уже не один (Польша), а целых три соседа, напрямую связанных с Северо-Атлантическим альянсом (добавились Латвия и Литва).



— Я знаю, что в Беларуси существуют мнения и представления о том, что НАТО — это очень агрессивная структура. И в то же время каждый раз, когда я это слышу, меня это очень удивляет. Во время моих поездок по регионам Беларуси мне часто задают такой вопрос: *"Да, господин Посол, Вы рассказываете нам, что Европейский Союз — очень дружественная структура, но не говорите такого же о НАТО?"* И я пытаюсь объяснить то же, что теперь хочу объяснить и вам: ошибочно считать, что НАТО — это что-то вражеское и враждебное. Атлантический альянс — это демократический альянс, это альянс стран, которые сами являются демократическими. И в качестве посла Франции я хотел бы сказать: если бы у альянса были бы какие-то другие, недемократические основы, Франция никогда бы не стала его частью. Беларусь ничего не потеряет от того, что стала свидетелем входа в НАТО своих ближайших соседей. Наоборот, Беларусь может даже выиграть. Не сочтите это парадоксом, но прежде всего может выиграть армия Беларуси, ибо военная техника в НАТО очень высокого уровня. Благодаря США, которые тоже являются членами НАТО, она пережила настоящую революцию.

Как известно, НАТО сделало предложение своим соседям — программу "Партнерство ради мира". И я считаю очень положительным, что военные власти Беларуси активно работают в рамках этой программы, ибо НАТО это и огромный интеллектуальный резервуар, что касается способов современной защиты. И никто в Беларуси не рассматривает белорусских офицеров, работающих в рамках этой программы, как предателей. Просто белорусская армия поняла, что это исключительно интересные контакты для модернизации белорусской военной техники.

— И Вы полагаете, что Беларусь может сделать следующий шаг — перейти от программы партнерства к членству в НАТО?

— Теоретически нет ничего невозможного. Но вы задали такой вопрос, который находится в политической области. Когда речь идет о вступлении (будь то в НАТО или ЕС), никогда не идет речь о каком-то насильственном побуждении. Это всегда вопрос свободного выбора, к примеру, как вступления в какой-нибудь клуб. Ведь если мы желаем войти в клуб, мы обязаны соблюдать правила, установленные для всех его членов. Я еще раз хочу подчеркнуть: НАТО, Европейский Союз — это те структуры, которые объединяют демократические страны. И может наступить тот самый день, когда белорусский народ сделает свой демократический выбор. Почему бы и нет?

— Трансформируются ли структуры НАТО в связи с возрастающей угрозой терроризма?

— Да, естественно, НАТО нуждается в адаптации. Всем известно, почему был создан этот альянс. Те угрозы, из-за которых он был создан, или совсем исчезли, или, по крайней мере, затухли. На сегодняшний день существует абсолютно новая угроза — угроза терроризма. И теперь НАТО, как, впрочем, и армии всех стран мира, естественно, нуждается в адаптации к угрозам современного мира. Привыкнуть к ним, адаптироваться, это очень большая трудность. НАТО адаптируется к этой угрозе точно так же и параллельно всем остальным структурам нашего мира.

— Возникает парадокс. Возьмем Испанию — члена НАТО: взрывы на вокзале, сотни убитых... Бывшая Югославия, где в некоторых регионах НАТО присутствует до сих пор в качестве миротворцев, — там тоже убийства. Простой белорусский человек видит все это по телевидению, и ему к тому же еще и вдалбливают: там, где НАТО, там кровь, там слезы... При этом ему уже почти не показывают Чечню... Что, НАТО не выполняет свои задачи или оно не должно выполнять функции предотвращения конфликтов?

— Если существуют подобного рода недоразумения, недопонимания, то необходимо сделать сравнение: НАТО — это как команда пожарных. Когда вы видите где-то пожарных, то, значит, там бушует огонь. А там, где их не видно, пожара нет...

— Г-н Посол, Вы говорили о новых соседях европейцев. В Минске сетуют, что объединенная Европа уделяет больше внимания Украине и Молдове, чем Беларуси. Это действительно так?

— Теоретически это неверно, поскольку для Европейского Союза каждый из его соседей одинаково важен. Но на практике это отчасти верно. Однако ответственность за это в определенной степени лежит на самой Беларуси. Со стороны Европы желание вести диалог с Беларусью существует всегда. Но вопрос вопросов — каким образом его начинать или же развивать? На самом деле, трудно делать какие-либо сравнения, поскольку у каждого из соседей Европейского Союза своя специфика.

— Но тут возникает вопрос о двойных стандартах, о которых постоянно твердит и сам Александр Лукашенко, и его идеологи. Ваше отношение к этому штампу?

— Я часто слышу от людей, занимающих в Беларуси руководящие посты, длинные речи о том, что мы, европейцы, якобы применяем по отношению к Беларуси двойные стандарты. Мол, то, что происходит, к примеру, в Туркменистане или Узбекистане, Европа рассматривает совсем иначе. Такие утверждения не соответствуют действительности. Но я понимаю, почему создается такое впечатление, ибо названные мной страны, в отличие от Беларуси, находятся далеко от Европы, и мы не можем воспринимать точно так же то, что происходит прямо у порога нашего дома, и то, что происходит достаточно далеко от нас. То, что происходит у соседей, имеет большую практическую важность для Европы. Ибо из Беларуси устремляется в Европу интенсивный поток людей, через вашу страну проходит множество товаров: как белорусских, так и транзитных. Я хотел, чтобы вы объяснили вашим читателям очень простой и понятный пример. Если шумят ваши соседи по лестничной клетке, то вам это хорошо слышно. И вы, естественно, волнуетесь, беспокоитесь. А если беспорядок несколькими этажами выше или ниже, то такой шум вас тревожит меньше. Именно отсюда, я думаю, исходят заблуждения насчет двойных стандартов, которые якобы применяет Европейский Союз. А что касается требования соблюдения прав человека в странах Средней Азии, в частности, в Туркменистане (Беларусь все-таки европейская страна), то Европейский Союз в ближайшее время вынесет этот вопрос на обсуждение Генеральной Ассамблеи ООН, то, что в принципе беспрецедентно. Так что никаких двойных стандартов нет, а наоборот, мы имеем очень последовательную позицию стран Евросоюза по всем этим вопросам.

(Окончание на 3-й стр.)

ПОСТСКРИПТУМ

Надежный щит

Россия решила «прикрыться» Беларусью от НАТО?

В ближайшее время Беларусь закупит у России зенитно-ракетные комплексы противовоздушной обороны С-300. Об этом стало известно после недавнего кратковременного визита в Минск министра обороны России Сергея Иванова. *"Контракт на поставки большого количества пусковых установок зенитно-ракетных систем С-300 выходит на подписание, и в ближайшее время он будет подписан. У меня нет никаких сомнений в этом"*, — сказал Иванов журналистам.

После встречи со своим белорусским коллегой Леонидом Мальцевым российский министр пошел еще дальше: применяя, видимо, бесценный опыт интеграционно-братского слияния и выдумывания разнообразных, чаще всего недееспособных высших советов, которые активно демонстрировали обществу в свое время Ельцин с Лукашенко, министр обороны России поддержал идею создать *"Высший военный совет, который должен управлять Вооруженными силами государства России и Беларуси"*. Предполагается, что в этот совет войдут президенты и премьер-министры наших стран, а также министры обороны и начальники генеральных штабов двух государств.

Зачем же Россия решила вдруг оптом продать (видимо, по оптовой цене) Беларуси свои ракетные комплексы? Специалисты хором говорят о том, что главной причиной акта внимания России к Беларуси стало очередное расширение НАТО на Восток. И защищать российские ракеты (кстати, нигде официально не заявляется о цене будущей сделки, возможно, ракеты будут проданы почти за так) будут отнюдь не белорусские рубежи, а "родные" — российские. Эти предположения подтверждают и слова российского гостя Иванова: *"Складывающаяся обстановка в мире и в Европе, в том числе расширение НАТО на Восток,* — сказал И. Иванов, — *подчеркивает необходимость более тесного сотрудничества России и Беларуси как в военно-политической, так и чисто военной области. Объединение оборонного потенциала двух стран является одним из важнейших факторов, способных оказать стабилизирующее влияние на ситуацию в Европе"*.

Будущая закупка нашей страной ракетных комплексов у России выглядит нелогичной еще в одном смысле: за последние несколько лет Беларусь просто погрязла в международных скандалах. Наш обыватель грешным делом может подумать, что все самое ценное оружие, которое было у Беларуси, уже продано, при этом не оставив ощутимого следа в статье доходов государственного бюджета Республики Беларусь, а теперь мы начинаем закупать его неизвестно на каких условиях у России.

Министр обороны Беларуси в 1991—1994 гг. **Павел КОЗЛОВСКИЙ** тем не менее в интервью "Народной воле" заявил, что в самом по себе военном сотрудничестве между Россией и Беларусью не видит ничего плохого: *"Кооперация, в том числе и в вопросе поставок вооружений в Беларусь и создания единых оборонительных систем ПВО, всегда выгодна. Нормальность этого подтверждает и опыт объединенной Европы, и опыт Америки. У нас уже есть ракетные комплексы С-300, которые стоят на боевом дежурстве, но они устаревают и у них заканчивается ресурс. Если поставляемые Россией комплексы будут служить единой системе ПВО России и Беларуси, я считаю это полезным для нашей страны. Но есть в этом всем одна большая опасность — Беларусь может оказаться для России своеобразным буфером, щитом, который в случае чего первый получит, грубо говоря, по морде"*.

После встречи российского и белорусского министров обороны у наблюдателей возник еще один вопрос, который волнует прежде всего граждан Беларуси, имеющих сыновей призывного возраста: отправятся ли после очередного акта нежности между руководствами России и Беларуси (на этот раз в военной сфере) наши парни на службу в Россию? В Чечню? Министр обороны Беларуси Леонид Мальцев вроде бы опроверг эту возможность, заявив, что *"белорусское законодательство не позволяет, чтобы белорусские солдаты служили в России, как и российское законодательство не позволяет солдатам служить в армиях других государств"*.

Впрочем, как показывает история карьеры этого военного чиновника, на 100 процентов надеяться на его слова не стоит. Все публичные выступления Л. Мальцева по радио и телевидению ОБЯЗАТЕЛЬНО содержат фамилию человека, который НА САМОМ ДЕЛЕ принимает все решения в государстве и которому г-н Мальцев, не моргая и не отвлекаясь, постоянно смотрит в рот. Даже после того, как его выставили с позором из актового зала медуниверситета, представив на весь белый свет горьким пьяницей.

С этой точкой зрения согласен и генерал Козловский: *"При этой власти может быть все что угодно. Если бы наша власть соблюдала законы, Конституцию, постоянно демонстрировала бы обществу свое уважение Конституции и законов, то обещаниям Мальцева можно было бы верить. Я лично им не верю"*.

Александр СИЛИЧ.

ЭКСПЕРТИЗА

Белорусы проспали Европу. Навсегда?

В то время как ночная Европа озарялась фейерверками в честь небывалого расширения ЕС, наша страна крепко спала, убаюканная казенными речами по поводу сомнительного юбилея белорусских профсоюзов.

Такое впечатление, что граждане государства в сердце континента проспали праздник единой Европы не только в буквальном, но и в символическом смысле.

Неужели проспали навсегда?

Александр КЛАСКОВСКИЙ

"Эх, Киса, мы чужие на этом празднике жизни!" — вспоминали крылатую фразу Остапа Бендера те продвинутые наши соотечественники, что смотрят по утрам "Евроньюс". Остальным государственное ТВ устами официального лидера предложило гордиться невиданным в мире единодушием власти и профсоюзов (надо понимать, тех, что под флагом ФПБ).

Да, слияние и впрямь редкостное, ибо классикой жанра вообще-то считается, когда зубастые тред-юнионы треплют казенные структуры, защищая права трудящихся. На то и щука в реке... Только не ў нас.

У нас, правда, еще дышат независимые профсоюзы, но их уже так прижали, что вопросом занялась специальная комиссия МОТ. Зато "правильные" профсоюзы — те, которыми командует бывший замглавы президентской администрации, — снова вошли в комфортную для своих боссов роль "школы коммунизма".

Вот и *"столетний юбилей профсоюзного движения в республике"* сподобились притянуть за уши для официозной саморекламы, или, как теперь говорят, пиара.

Притом что сто лет назад и близко не было нашей республики, а был только Северо-Западный край России. Если же говорить о первых профсоюзах **на территории** нынешнего суверенного государства, то, как гласит "Беларуская энцыклапедыя", здесь *"профсоюзное движение началось в конце 19-го столетия. Среди первых возникли профессиональные союзы щетинщиков (1894), кожевенников Сморгони, Белостока, Вильно, Ошмян и Кринок (1898), печатников Гомеля (1901)..."*.

Как видим, щетинщикам и кожевенникам Сморгони не повезло. Историографы из ФПБ отсекли их от истоков процесса ради круглой цифры. И эта искусственная юбилейщина тоже живо напоминает о советских агитпроповских подходах.

Так что, Беларусь навсегда застряла в светлом прошлом? Европейский поезд ушел? А может, нам и не надо на этот поезд, ибо мы сами — локомотив восточнославянской цивилизации, как заявляет официальный лидер?

Политолог **Андрей Федоров** считает, что если страна начнет решительно двигаться по пути европейской интеграции, то вполне по силам пройти его лет за десять. И путь этот не закрыт. Ответственные лица ЕС, выступая на нынешних торжествах по поводу расширения, заявляли, что оно — не последнее.

"Другое дело, — подчеркнул Андрей Федоров в интервью *"Белорусским новостям", — что менталитет нынешнего белорусского руководства и лидеров объединенной Европы совершенно не стыкуются. Официальный Минск по-прежнему предпочитает искать — и в конце концов действительно наживать — недругов. Вот уже и Москва смотрит "исключительно через прицел газовой трубы". Но в этой самоизоляции белорусским властям по-своему комфортно! Потому что легче добиваться нужных электоральных результатов, когда народ в значительной мере отрезан от внешней информации, когда непрозрачны для международного сообщества избирательные процедуры".*

По мнению другого известного белорусского политолога — **Виктора Чернова,** наша страна сохраняет потенциал для энергичных реформ. Главное зависит от политической воли власти. В то время как соседи — Польша, страны Балтии и другие, вдоволь хлебнувшие прелестей соцлагеря, мучительно реформировались под стандарты Европы, Александр Лукашенко затеял соблазнительный, проникнутый духом ретро союзный проект. Который, однако, закончился пресловутым "прицелом газовой трубы".

Страна села в галошу. И дешевый газ с востока иссяк, и Запад со своими неумолимыми правилами демократии и рынка окружил уже почти со всех сторон.

В интервью *"Белорусским новостям"* Виктор Чернов подчеркнул, что перспективы развития Беларуси в общеевропейском контексте во многом будут зависеть от внутриполитических событий ближайших двух-трех лет. При этом даже смена президента не гарантирует европейского выбора. Ибо Москва — а ее влияние на белорусскую ситуацию достаточно велико — естественно, будет делать ставку на пророссийскую фигуру.

"При этом масса наших сограждан, — констатирует эксперт, — *не отдает себе отчета, что будущее в большой степени зависит от их выбора. Преобладает психология: мы люди маленькие, а что мы можем? Даже многие из недовольных политикой властей считают: система настолько мощна, что ее не сломаешь. Именно гражданская пассивность позволяет руководящей элите реанимировать порядки коммунистического прошлого. С другой стороны, Беларусь как осколок советской империи чувствует себя неприкаянно..."*.

Отсюда, добавим, и периодические рассуждения с высоких трибун о *"диких кренах"*, о необходимости усилить западное направление дипломатии. Правда, потом обычно следует какая-нибудь очередная оплеуха Западу, типа нынешнего отказа послам стран ЕС организовать (не для себя, заметьте, а для белорусов же!) празднество в минском цирке. И все возвращается на круги своя, разве что только крепчает изоляционистский маразм.

Эксперты *"Белорусских новостей"* сходятся в том, что естественный вектор развития нашей страны — европейский. Однако он отнюдь не запрограммирован некими высшими силами. Сам народ призван определить, что для него перспективнее — флаг объединенной Европы или пропахшие нафталином транспаранты добровольно-принудительных маевок.

("Белорусские новости".)

ВОКРУГ ЧП

Лучше уж «погореть» на корте

Едва не обернулась трагедией для белорусского теннисиста **Максима МИРНОГО** *и его жены* **Ксении** *поездка в Рим, где Максим принимает участие в очередном турнире.*

В ночь с пятницы на субботу около четырех утра в одном из лучших отелей Рима "Парко дей Принчипи", где и расположились многие теннисисты турнира, вспыхнул сильный пожар.

"Очаг возгорания оказался в 305-м номере, а мы с Ксюшей жили в 303-м, — рассказал о происшествии Макс. — *Жена почувствовала запах гари, мы выглянули в коридор, но он был полностью задымлен. Из окна соседнего номера уже вырывалось пламя. Ничего не оставалось, как по-быстрому намочить полотенца, обмотаться ими и прорываться сквозь жар и дым на улицу. Выскочили без одежды, схватили только кошелек и мобильный телефон, которые лежали на тумбочке возле кровати. На улице было достаточно холодно, но мы связались с белорусским посольством в Риме, после чего на место происшествия приехал наш посол и отвез к себе домой".*

По последним данным, в гостинице выгорели 3-й и 4-й этажи, 3 человека погибли. Теннисистов переселили в другую гостиницу, и сейчас Макс восстанавливается от шока и ждет свою спортивную амуницию, чтобы все же принять участие в теннисном турнире.

Алесь СИВЫЙ.


Народная Воля

4 МАЯ 2004 г.

СПОРТ

На нашей улице опять праздник

В минувшие выходные в столичном Дворце спорта прошел турнир Гран-при "BelSwissBank" по художественной гимнастике



Как и было обещано зрителям, в Минск приехали чемпионка мира украинка **Анна Бессонова**, мировая звезда художественной гимнастики россиянка **Алина Кабаева**, естественно, выступили и лучшие белорусские спортсменки **Инна Жукова, Светлана Рудалова**... Не появилась из-за травмы разве что еще одна именитая российская "художница Ирина Чащина, которая на ковре с Алиной — непримиримые враги (даже для журнала "Vogue" они снимались в виде бойцов на подпольном ринге), а в жизни — лучшие подружки (даже допинговую дисквалификацию отбывали одновременно).

Впрочем, турнир и так впечатлил. Великолепная светотехника, красочное убранство Дворца, безупречная организация и, конечно же, сами гимнастки — для праздника было все. Тем более что настроение у белорусских болельщиков стало еще более праздничным, после того как в первый, субботний, день наша Инна Жукова заняла 1-е место в многоборье (2-е место у Алины Кабаевой, 3-е — у Анны Бессоновой). В воскресенье прошли финалы в отдельных упражнениях, где Инна завоевала три "бронзы" и одно "серебро", Анна — "золото", два "серебра" и одну "бронзу", а Алина — три "золота" и "серебро".

— Алина, Вы неплохо выступили, — подхожу к Алине Кабаевой. **— А говорят, что у Вас проблемы с весом...**

— Нет, это раньше случалось, что я немного нарушала спортивную дисциплину. Но то были детские шалости. Сейчас усиленно готовлюсь к Олимпиаде, не до тортиков. Даже 12 мая, в свой День рожденья, лишнего себе не позволю.

— В личной жизни...

— Сильно не переживайте, все нормально.

Как говорят: "Каждый труд должен быть оплачен", поэтому спортсменки, кроме морального удовлетворения от побед, получили еще и материальное (за первое место давали что-то около 1100 евро, призеры получили чуть поменьше).

Не обошли вниманием и журналистов. Спонсор Гран-при дал для них обед в ресторане гостиницы "Юбилейная", а директор Дворца спорта **Геннадий Алексеенко** по-доброму предлагал корреспонденту "Народной воли" сало с чаем.

Кстати, сам Дворец был забит под завязку, хотя в первый день, по словам его главного бухгалтера, было продано 333 билета (при вместимости — 2500), а за пару часов до начала шоу — 600.

Но те, кто выложил свои кровные 10 тысяч на шоу звезд, думаю, не пожалели. Нет смысла пересказывать все театрализованное представление — это надо было видеть. Но, пожалуй, самые бурные аплодисменты сорвала 4-летняя **Диана Янкович**, которая так "сексуально" исполнила композицию "Я шоколадный заяц", что публика аж стонала от восторга.

После закрытия турнира зрители расходились довольными. Если кто и был не в настроении, так это продавец маек с изображением сборной Беларуси по художественной гимнастике и Инны Жуковой: "Майка стоит всего 10 тысяч, а ни одной не купили! Что за народ!"

Народу, будем думать, хватило зрелища вживую.

Алесь СИВЫЙ.

На фото: *восходящая белорусская звезда Светлана Рудалова.*

photo.bymedia.net

У футболе лідэры ўсё тыя ж

На чэмпіянаце Беларусі па футболе сярод каманд вышэйшай лігі прайшлі гульні чацвёртага тура. У верхняй частцы турнірнай табліцы без змяненняў. Па-ранейшаму не ведаюць паражэнняў мінскае і жодзінскае "Тарпеда". Мінчане выйгралі ў мазырскай "Славіі" — 1:0, а жодзінцы перамаглі сталічную "Зорку-ВА-БДУ" — 5:2.

Чэмпіён краіны футбольны клуб "Гомель" выйграў у віцебскага "Лакаматыва" з лікам 2:0, а сярэбраны прызёр мінулагодняга першынства барысаўскі БАТЭ разграміў сталічны МТЗ-РЫПО — 3:0. З такім жа лікам мінскія дынамаўцы выйгралі ў сваіх брэсцкіх аднаклубнікаў.

Наваполацкі "Нафтан" прайграў дома "Дарыдзе" — 1:2.

Дзве сустрэчы гэтага тура завяршыліся ўнічыю 1:1. Так згулялі магілёўскі "Днепр-Трансмаш" з салігорскім "Шахцёрам" і гродзенскі "Нёман" з бабруйскай "Белшынай".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Спорт-экспрэс

Працягваецца чэмпіянат свету па хакеі ў Празе. Вось першыя вынікі матчаў кваліфікацыйнага раунда ў групах "Е" і "F":

Група "Е". 30 красавіка. Канада—Латвія — 2:0, Чэхія—Аўстрыя — 2:0. **1 мая.** Латвія—Швейцарыя — 1:1, Аўстрыя—Германія — 1:3. **2 мая.** Швейцарыя—Чэхія — 1:3, Канада—Германія — 6:1.

Група "F". 30 красавіка. Швецыя—Фінляндыя — 1:1, Славакія—Расія — 2:0. **1 мая.** Фінляндыя—Данія — 6:0, Расія—ЗША — 2:3. **2 мая.** Данія—Славакія — 0:8, Швецыя—ЗША — 3:1.

У чвэрцьфіналы з кожнай групы выйдуць па чатыры лепшыя каманды.

***

Звольнены галоўны трэнер мінскай хакейнай каманды "Дынама" Уладзімір Мелянчук.

Учора ў дынамаўскі стан павінен быў прыбыць славацкі спецыяліст Бранілаў Шайбан, які ў свой час кіраваў вядомымі славацкімі клубамі "Слован", "Попрад" і "Нітра".

Першамай з мардабоем

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) разам са сваімі саюзнікамі па Еўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" адсвяткавалі Дзень працы.

У Мінску актывісты гарадской арганізацыі БСДП (НГ) і маладыя сацыял-дэмакраты ўдзельнічалі ў санкцыянаванай Мінгарвыканкамам маёўцы ў парку Янкі Купалы. Сацыял-дэмакратаў падтрымалі незарэгістраваныя маладзёжныя рухі "Малады Фронт" і "ЗУБР", Партыя жанчын "Надзея", Еўрапейскі Рух і Еўрапейскі Дом.

Спакойныя паводзіны сацыял-дэмакратаў чамусьці выклікалі неадэкватную рэакцыю ўлад. Невядомыя ў цывільным напалі на ўдзельнікаў акцыі. Іх збівалі, адбіралі сцягі і лозунгі. Некаторых маладых людзей, якія трымалі нацыянальна-гістарычныя сцягі і сцягі Еўрасаюза схапіўшы за рукі і ногі, цягнулі ў міліцэйскія машыны. Рабіліся спробы адабраць сцягі БСДП (НГ), але сацыял-дэмакратам удалося абараніць сваю сімволіку. Былі затрыманы пяць удзельнікаў маёўкі. У тым ліку такі вядомы актывіст, як Павел Гормаш. Пазней яму было прад'яўлена абвінавачванне ў "распаўсюджванні ўлётак, якія заклікаюць да ўступлення ў Еўрасаюз".

Перад сабраўшыміся выступіў старшыня БСДП (НГ) Мікалай Статкевіч, які павіншаваў усіх са святам, выказаў рэзкі пратэст супраць дзеянняў улад і запатрабаваў вызвалення Міхаіла Марыніча. Пасля мерапрыемства М.Статкевіч, прадстаўнікі гарадской партарганізацыі, шэраг маладых сацыял-дэмакратаў прыехалі ў РУУС Цэнтральнага раёна Мінска, дзе ўжо знаходзіліся іх затрыманыя таварышы. Усе затрыманыя былі вызвалены.

Акцыі сацыял-дэмакратаў прайшлі таксама ў буйных гарадах Беларусі — Гомелі, Брэсце, Віцебску, Гродне, Магілёве і іншых.

Алесь САВІЦКІ.

Адкрыты ліст міністру адукацыі Рэспублікі Беларусь А.М.Радзькову

Выратуйце ліцэй!

Паважаны Аляксандр Міхайлавіч!

Пішу Вам пенсіянер, які больш за 45 гадоў жыцця і працы прысвяціў выхаванню маладога пакалення, але які і сёння ўважліва сочыць за ходам школьнай рэформы: многае ўхваляе, штосьці выклікае пярэчанне. Але больш за ўсё мяне насцярожвае, а часам і абурае асобныя ўчынкі кіраўніцтва Міністэрства адукацыі.

Вы, Аляксандр Міхайлавіч, ведаеце, што ўпершыню ў гісторыі станаўлення асветы ў Беларусі ў 1992 годзе ў Мінску быў адкрыты Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа. Адным з заснавальнікаў ліцэя, а затым і яго дырэктарам быў Уладзімір Колас, асоба кампетэнтная, аўтарытэтная, знаўца некалькіх замежных моў. Менавіта яго намаганнямі быў сфарміраваны высокакваліфікаваны педагагічны калектыў ліцэя, які па навуковым узроўні мог папабарнічаць з педагагічнымі калектывамі некаторых ВНУ.

Сярод выкладчыкаў ліцэя: доктар філалагічных навук, прафесар Міхась Тычына, доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, літаратуразнаўца, які дасканала валодае васьмю мовамі, кандыдат філалагічных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Васіль Сёмуха, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Пятро Васючэнка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Пятро Садоўскі, кандыдат філалагічных навук Ігар Войніч, кандыдат гістарычных навук Павел Лойка, кандыдат мастацтвазнаўства Яўген Шунейка, выкладчыкі беларускай мовы Уладзімір Дзіско і Валянціна Сіўковіч, беларускай літаратуры — Вольга Дзядзюля, гісторыі Беларусі — Наталля Лойка, замежных моў — Уладзімір Шатон, Таццяна Магучава, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, выкладчыца геаграфіі Ірына Сідарэнка, выкладчык фізічнага выхавання Міхась Барысевіч і іншыя.

Пад кіраўніцтвам Уладзіміра Коласа яны стварылі зладжаны і працаздольны калектыў аднадумцаў, у якім кожны імкнуўся выкладаць свой прадмет на высокім прафесійным узроўні. Глыбока і дасканала ліцэісты вывучалі родную і замежныя мовы, нацыянальную і сусветную гісторыю і культуру. Увесь комплекс вучэбна-выхаваўчага працэсу і пазакласнага жыцця ліцэістаў быў накіраваны на ўдасканаленне і ўзбагачэнне іх ведаў, на павышэнне грамадзянскай і нацыянальнай свядомасці, на развіццё іх духоўнасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі, на выхаванне шчырых патрыётаў Радзімы — будучай нацыянальнай эліты. Інтэлектуальнаму развіццю навучэнцаў садзейнічаюць ліцэйскі тэатр, у якім ролі акцёраў выконваюць самі ліцэісты, друкаваная газета "Трыкутнік" з накладам амаль каля 300 асобнікаў, у якой свае допісы і карэспандэнцыі (аб праекце вучнёўскага самакіравання, пра неабходнасць кіравацца ў сваіх паводзінах правіламі этыкету, пра гістарычныя мясціны роднага краю, пра асобныя эпізоды з жыцця пісьменнікаў і іх твораў і інш.) змяшчаюць навучэнцы.

Коласаўскіх ліцэістаў акрыляла, натхняла і тое, што яны вучацца ў сярэдняй навучальнай установе такога тыпу, у якой у 1811—1817 гг. вучыўся вялікі рускі паэт А.С.Пушкін (Царскасельскі ліцэй), а іх знакаміты зямляк — выдатны беларускі паэт М.А.Багдановіч у 1916 годзе скончыў Яраслаўскі Дзямідаўскі ліцэй.

Асабліва імпануе навучэнцам існуючая ў ліцэі атмасфера добразычлівасці і ўзаемапавагі. Настаўнікі размаўляюць з імі, як з дарослымі. Для ліцэістаў ліцэй стаў родным домам. Відавочна, ва ўмовах ўзаемаразумення і ўзаемадаверу паміж настаўніцкім і вучнёўскім калектывамі праца прыносіць плён і задавальненне. Звяртаючыся да сваіх калег — настаўнікаў Беларусі, выкладчыкі ліцэя пісалі: "мы... сапраўды кожны дзень ішлі ў наш ліцэй, як на свята". Пра стабільна высокі ўзровень навучання ў ліцэі сведчылі разнастайныя праверкі і тое, што ліцэісты перамагалі на рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах і паспяхова здавалі ўступныя экзамены пры паступленні на самыя прэстыжныя спецыяльнасці ў ВНУ. Ды і сам тагачасны міністр адукацыі П.І.Брыгадзін адзначаў: "Педагагічны калектыў працаваў добра". Паспяхова творчай працай педагогаў былі задаволены і навучэнцы, і іх бацькі.

Аднак па чыйсьці злой волі ў 1998 годзе Уладзіміра Коласа без тлумачэння прычын вызвалілі ад пасады дырэктара ліцэя і прызначылі яго намеснікам дырэктара з правам апаратыўнага кіравання. Несумненна, гэта была чыясьці наўмысная задума з намерам абразіць, зняважыць таленавітага, прыстойнага чалавека і кіраўніка. Тым не менш навучальна-выхаваўчы працэс пад кіраўніцтвам Уладзіміра Коласа і ў далейшым, на працягу яшчэ 5 гадоў, ажыццяўляўся на належным узроўні.

І толькі 28 мая 2003 года загадам Міністэрства адукацыі на пасаду дырэктара ліцэя была прызначана Т. Г. Шчарбачэвіч. Пазнаёміўшыся з ёю, выкладчыкі, ліцэісты і іх бацькі пераканаліся, што Тамара Георгіеўна не валодае тымі якасцямі, якія неабходныя для кіраўніка навучальнай установы з такім нацыянальным патэнцыялам, як Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа. Больш таго, высветлілася, што новапрызначаны дырэктар слаба валодае беларускай мовай. Вось таму калектыў ліцэя і выказаў ёй недавер.

Відавочна, што органы адукацыі ў гэтым выпадку наступілі на тыя самыя граблі, на якія часта наступалі ў савецкі перыяд, калі ў беларускамоўныя школы прызначалі выкладчыкаў, а то і дырэктараў, якія не ведалі беларускай мовы. Свядома ці па недаразуменні ствараўся недарэчная сітуацыя: падручнікі ў школах былі беларускія, а выкладчык выкладаў урок на рускай мове, навучэнцы асобныя выразы (словы) часткова не разумелі. А на наступным уроку на пытанні выкладчыка вучні адказвалі па-беларуску, але іх часткова ўжо не разумеў настаўнік. Узнікалі непаразуменні паміж настаўнікам і вучнямі. Пры гэтым з дапамогай такіх выкладчыкаў вучні замест удасканалення беларускай літаратурнай мовы набывалі навыкі "трасянкі". Зразумела, што Тамара Георгіеўна трапіла ў няёмкае становішча. Па-чалавечы ёй варта было паспачуваць. Але і сама яна павінна была зразумець, што кіраваць калектывам, які цябе не прызнае, будзе цяжка, а то і немагчыма. На мой погляд, Тамары Георгіеўне трэба было ўтаймаваць сваю гордасць і паспрабаваць знайсці агульную мову з выкладчыкамі, навучэнцамі і іх бацькамі. Яна ж, наадварот, пачала дзейнічаць з пазіцыі сілы, з пазіцыі дадзеных ёй паўнамоцтваў, праяўляючы некарэктныя адносіны як да настаўнікаў, так і да іх бацькоў. Таму бацькі ліцэістаў у пачатку чэрвеня 2003 года напісалі пісьмо міністру адукацыі П.І.Брыгадзіну з просьбай *"перагледзець рашэнне аб прызначэнні на пасаду дырэктара ліцэя Т.Г.Шчарбачэвіч"*, сцвярджаючы, што яны не могуць даверыць Тамары Георгіеўне выхаванне сваіх дзяцей. Адначасова бацькі выказалі пажаданне бачыць на пасадзе дырэктара ліцэя спадара Уладзіміра Коласа, а калі гэта немагчыма, тады няхай У.Колас па-ранейшаму *"застаецца намеснікам дырэктара, а дзеці спакойна вучацца далей"*. У тым жа пісьме бацькі выказалі павагу да міністра і надзею, што *"яшчэ не позна прыняць правільнае рашэнне"* ("Народная воля" ад 12 чэрвеня 2003 г.).

Каб асабіста разабрацца ў такой далікатнай сітуацыі і прыняць канчатковае рашэнне правільна, не адкладваючы да святога нікды, у першай дэкадзе чэрвеня ў ліцэй прыехаў сам міністр адукацыі П.І.Брыгадзін. Пётр Іванавіч уважліва выслухаў усіх выкладчыкаў, бацькоў навучэнцаў, якія ў адзін голас заявілі, што прызначэнне Тамары Шчарбачэвіч новым дырэктарам — няўдалы выбар. Пры гэтым бацькі навучэнцаў *"прасілі міністра не перашкаджаць нармальнай працы ліцэя"*, маючы на ўвазе і праверкі, што ўчасціліся ў апошні час. Міністр не быў шчырым у сваіх адказах на пытанні настаўнікаў і бацькоў ліцэістаў. На пытанне: "Чаму дзяржаўныя чыноўнікі адмаўляюць Уладзіміру Коласу ў праве займаць пасаду дырэктэра ліцэя?", міністр ад адказу ўхіліўся. Няпэўна, невыразна адказваў ён і на іншыя пытанні. Уніклівая, скрупулёзная Марына Коктыш у сваім артыкуле "Змаганне за ліцэй" ("Народная воля", ад 17 чэрвеня 2003 г.) адзначыла некаторыя адказы міністра: *"Мы будзем прымаць рашэнне, як далей будзе працаваць ліцэй". Ёсць розныя прапановы. Магчыма змена статуса ліцэя. Магчымы перавод ліцэя на новую пляцоўку, для таго каб зрабіць усе рамонтныя работы. Безумоўна, потым гэтая пляцоўка застанецца за ліцэем" ...Пры гэтым міністр заявіў", што свой загад аб прызначэнні новага дырэктара Тамары Шчарбачэвіч адмяняць не збіраецца"*. Нам здаецца, што ў дадзеным выпадку Пётр Іванавіч не ўлічыў псіхалагічнага моманту, ведаючы, што там, дзе сутыкаецца недавер'е калектыву да новапрызначанага кіраўніка і крыўда апошняга, нараджаюцца канфлікты. Аднак з усяго таго, пра што гаварыў П.Брыгадзін, не вынікала, што над Коласаўскім ліцэем ужо павіс дамоклаў меч, што да яго скону засталіся лічаныя дні і гадзіны, хоць ён і заявіў, што мэта яго прыезду — азнаямленне з думкай калектыву ліцэя, што пасля гэтага яны (кіраўнікі міністэрства — **А.К.**) "будуць думаць". Але, на жаль, думалі яны нядоўга...

Праз некалькі дзён, а дакладней 25 чэрвеня 2003 года пастановай Савета міністраў № 850, падпісанай прэм'ер-міністрам Г.В.Навіцкім, Нацыянальны дзяржаўны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа быў ліквідаваны, як сказана ў пастанове, *"з мэтай аптымізацыі сістэмы навучальных устаноў"*. Можна не сумнявацца ў тым, што Г.В.Навіцкі, падпісваючы пастанову аб ліквідацыі ліцэя, і паняцця не меў, пра якую *"аптымізацыю сістэмы навучальных устаноў"* гаварылася ў пастанове, якую ён безадказна падпісаў. Незалежна ад таго, прымалася такое рашэнне ўрада з палітычнымі прысмакамі ці без іх, відавочна адно: гэта быў акт самавольства і беззаконня, грубага парушэння норм маралі і чалавечнасці, існуючых беларускіх і міжнародных юрыдычных актаў — Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і канвенцыі ААН "Аб правах дзіцяці".

Нават цвярозаму розуму недаступна зразумець, чаму, на якой падставе, якое дзяржаўнае злачынства ўчынілі, якія законы суверэннай Рэспублікі Беларусь парушылі навучэнцы ліцэя і іх настаўнікі, каб вось так — нізашто, самавольна адабраць у іх памяшканне (Кірава, 21) і выкінуць на вуліцу 150 дзяўчат і юнакоў — навучэнцаў ліцэя і пазбавіць працы дзесяткі высокакваліфікаваных выкладчыкаў, прымусіўшых іх стаць беспрацоўнымі. Гэта ж відавочны здзек з нашых суайчыннікаў, знявага, абраза іх пачуцця чалавечай годнасці. Апраўдваць здзейсненую бязлітаснасць спасылкамі на рамонт памяшкання ліцэя і тым, што навучэнцы ліцэя не выкінуты на вуліцу, а размеркаваны па школах, па месцы іх жыхарства — гэта ж не што іншае, як ханжаства, крывадушнасць, апраўданне беззаконня.

Гутарка ідзе пра дзяцей нашых суайчыннікаў, якія паступалі вучыцца ў беларускамоўны ліцэй. Дык па чыёй жа злой волі іх пазбавілі магчымасці вучыцца на роднай мове ў выбранай імі і іх бацькамі навучальнай установе — ліцэі?

У сувязі з такой недарэчнай развязкай канфліктнай сітуацыі ствараецца ўражанне, што былы міністр адукацыі П.І.Брыгадзін (доктар гістарычных навук, прафесар — сам выкладчык універсітэта) не без аглядкі на вярхі пагадзіўся прыняць самае ганебнае рашэнне: лепш знішчыць адну з лепшых сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі з высокім навуковым патэнцыялам выкладчыцкага складу, у якой вучыліся і працавалі каля 2-х соцень ліцэістаў і настаўнікаў, чым адмяніць свой загад аб прызначэнні новага дырэктара гэтай навучальнай установы, якога можна без страты яго аўтарытэту прызначыць у іншую навучальную ўстанову. Прымаючы такую бязлітасную пастанову аб знішчэнні ліцэя, беларускі ўрад разам з былым міністрам адукацыі П.І.Брыгадзіным, відаць кіраваўся не гуманнымі адносінамі да людзей, не павагай да чалавечай годнасці, не законамі цывілізаванага свету, а драконаўскімі законамі. Менавіта таму ў народзе гавораць: нішто так не апякае душу, як холад і раўнадушнасць бюракратаў — чыноўнікаў.

Мне ў свой час давялося працаваць у Міністэрстве асветы БССР пад кіраўніцтвам выдатнага вучонага ў галіне педагогікі, аўтара прац па пытаннях школазнаўства і дыдактыкі. Заслужанага настаўніка БССР, прафесара, члена-карэспандэнта АПН СССР С.А.Умрэйкі — чалавека шчодрай душы і высокай культуры. Накіроўваючы нас, інспектараў, у раёны і вобласці для праверак школ, ён вучыў: выяўляць не толькі недахопы ў працы, але бачыць і майстроў педагагічнай справы, таленавітыя школьныя калектывы, абагульняць вопыт іх працы, з дапамогай якога яны дабіваюцца высокай паспяховасці вучняў. Адначасова Сцяпан Андрэевіч раіў нам у сваіх справаздачах называць і характарызаваць як перадавых настаўнікаў, так і цэлыя школьныя калектывы, падтрымліваць іх адабрэннем, пахвалой, рэкамендаваць да ўзнагарод.

Несумненна Сцяпан Андрэевіч быў бы надзвычай задаволены, каб у сістэме тагачаснага Міністэрства асветы працавалі такія высокакваліфікаваныя педагагічныя калектывы, як у Нацыянальным гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа, якія давалі сваім навучэнцам глыбокія і трывалыя веды.

Паважаны Аляксандр Міхайлавіч!

Са сказанага вышэй вынікае, што Вашай віны ў ліквідацыі ліцэя няма. Аднак вядома, што 2003—2004 навучальны год пачынаўся ўжо пад Вашым кіраўніцтвам і сустрэчу з журналістамі ў Нацыянальным прэсцэнтры напярэдадні Дня настаўніка праводзілі Вы. На сустрэчу з Вамі, Аляксандр Міхайлавіч, прыйшлі з плакатамі і некалькі дзесяткаў навучэнцаў ліцэя. На іх плакатах не было дзёрзкіх палітычных патрабаванняў, а толькі наіўныя дзіцячыя надпісы: "Я люблю свой ліцэй!"

Вы, Аляксандр Міхайлавіч, не палічылі магчымым падысці да іх і паглядзець у дзіцячыя вочы, у якіх Вы змаглі б спазнаць і боль, і пакуты, і просьбы... Мяне, як педагога і былога інспектара Міністэрства асветы БССР, Ваш учынак крануў за жывое і ўсхваляваў. Немагчыма зразумець, чым кіраваліся Вы ў тыя хвіліны: асабістай бездапаможнасцю ці баязлівасцю наклікаць на сябе чыйсьці гнеў? Але зразумела адно: міністр адукацыі не можа быць абыякавым да лёсу дзяцей нашых суайчыннікаў, якія з патрыятычным настроем, сааддана вывучаюць усе прадметы вучэбнай праграмы на роднай мове. Ды і бацькі ліцэістаў законна патрабуюць: дзеці павінны вучыцца, як і вучыліся 12 гадоў дагэтуль — разам і ў сваіх настаўнікаў.

Вы, Аляксандр Міхайлавіч, на сустрэчы з журналістамі, пра якую ўжо гаварылася, зусім слушна заявілі, што і Міністэрства адукацыі *"нясе адказнасць за дзяцей"*, што *"дзеці не павінны пакутаваць"*, а вучыцца і што *"якаснае навучанне магчыма толькі ў навучальнай установе"*. Але ўжо блізіцца да давяршэння навучальны год, а 120 ліцэістаў — дзяцей беларусаў вучацца не ў класных памяшканнях, а вандруюць па розных прыватных кватэрах і іншых мясцінах сталіцы. А зімнюю сесію ліцэістам давялося праводзіць не ў Мінску, а ехаць у сталіцу суседняй Літвы — Вільнюс. Дык хіба ж гэта не абсурд?

Няўжо Міністэрства адукацыі і ўрад Рэспублікі Беларусь не разумеюць, што ліквідацыя Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа — акт беззаконня, які перш за ўсё ганьбіць беларускі народ. Менавіта ў Вашай кампетэнцыі, Аляксандр Міхайлавіч, як міністра адукацыі, зрабіць усё неабходнае, каб стварыць нармальныя ўмовы для далейшай вучобы навучэнцаў ліцэя.

Дарэчы, нам, беларусам, нельга быць маўклівымі сузіральнікамі закрыцця беларускамоўных навучальных устаноў па фальшывых матывах безадказных чыноўнікаў Міністэрства адукацыі і іншых урадавых бюракратаў. Хіба ж можна пагадзіцца з тым, што за апошнія гады ў Беларусі былі закрыты сотні беларускамоўных школ, што ідзе разбурэнне нацыянальнай сістэмы адукацыі.

Асабіста мяне парадавала тое, што наперакор усім агіднасцям беларускамоўны ліцэй жыве і працуе дзякуючы таму, што і ў нашай дзяржаве ёсць беларусы з пачуццём уласнай годнасці, здольныя супраціўляцца беззаконню, здольныя абараніць сябе і сваіх дзяцей. Яшчэ ў жніўні месяцы 2003 года бацькоўская рада ліцэістаў прыняла рашэнне: у сувязі з закрыццём ліцэя іх дзеці будуць вучыцца на беларускай мове самастойна па праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі. Затым яны звярнуліся да выкладчыкаў з просьбай дапамагчы іх дзецям працягваць вучобу. І трэба аддаць належнае выкладчыкам і іх кіраўніку Уладзіміру Коласу за іх самаахвярны ўчынак. Яны пагадзіліся застацца з дзецьмі і дапамагаць ім засвойваць праграмны матэрыял, хоць ніхто не гарантаваў ім сталую зарплату.

Шаноўны Аляксандр Міхайлавіч! Вы ведаеце, што навучэнцы і выкладчыкі ліквідаванага ліцэя працягваюць вучобу ў жудасных умовах. За многія месяцы яны дастаткова нагараваліся. Таму бацькі ліцэістаў яшчэ ў лістападзе 2003 года звярнуліся да Вас з просьбай сустрэцца і параіцца, як быць далей, як можна палепшыць умовы навучання іх дзяцей. Зразумела, бацькі хочуць, каб іх дзеці па-ранейшаму, як і 12 гадоў таму, вучыліся разам у беларускамоўным ліцэі і ў сваіх кваліфікаваных настаўнікаў. Дык чаму ж Вам, Аляксандр Міхайлавіч, нельга пайсці ім насустрач і задаволіць іх просьбу? Усё, аб чым яны просяць, у Вашай кампетэнцыі, у кампетэнцыі міністра адукацыі! Калі ж хтосьці пярэчыць, не дазваляе Вам, міністру, задаволіць законную просьбу бацькоў ліцэістаў, тады скажыце пра гэта шчыра і праўдзіва ім і нам, грамадзянам Беларусі?

З павагай і пашанай —

Аляксей КЛАЧКО,
"Выдатнік народнай асветы", заслужаны настаўнік БССР, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, ветэран вайны і працы, пенсіянер за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь.

P.S. *Выказваючы ўдзячнасць "Народнай волі" за публікацыю адкрытага ліста міністру адукацыі, хачу заўважыць, што на гэты крок мяне вымусіў пайсці адказ на маё пісьмо, адрасаванае А.М.Радзькову начальніка Упраўлення агульнай і сярэдняй адукацыі міністэрства У.К.Шчэрбы. Шчыра кажучы, я спадзяваўся, што міністр адукацыі Аляксандр Міхайлавіч сам адкажа на маё пісьмо або запросіць мяне для размовы і растлумачыць сваё бачанне прычыны ліквідацыі Коласаўскага ліцэя з пункту погляду сучаснага члена ўрада. Магчыма, міністр перагружаны працай і даручыў адказаць на маё пісьмо У.К.Шчэрбе, тым больш што зліквідаваны ліцэй падпарадкоўваўся непасрэдна ўпраўленню, якім кіруе У.К.Шчэрба. Зразумела, гэта права і справа міністра, каму даручыць адказаць на пісьмо. Хаця, падкрэслю, я пісаў сваё пісьмо міністру адукацыі А.М.Радзькову, кіруючыся чалавекалюбствам і спадзеючыся на ўзаемнасць і паразуменне. На жаль, У.К.Шчэрба даступна і пераканаўча не адказаў ні на адно з пастаўленых мною пытанняў і сцвярджэнняў. Спасылкі Уладзіміра Канстанцінавіча на тое, што ліцэй знаходзіўся "ў прамым падпарадкаванні Міністэрству адукацыі" і гэта быццам бы "стварала мноства праблем у кіраванні дзейнасцю ліцэя, яго навучальна — метадычным і матэрыяльна — фінансавым забеспячэнні", на самай справе неабгрунтаваныя і несур'ёзныя.*

Калі ж такое падпарадкаванне на самай справе "стварала мноства праблем у кіраванні дзейнасцю ліцэя", тады хто перашкаджаў міністэрству перадаць "Нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа" ў распараджэнне Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама з захаваннем колькаснага складу навучэнцаў і педагагічнага калектыву, прысвоіўшы яму статус "Мінскі дзяржаўны гуманітарны ліцэй". Больш таго, кіраўніцтва ліцэя са згоды бацькоў навучэнцаў звярталася ў вышэйшыя кіруючыя інстанцыі з прапановай — надаць ліцэю статус прыватнага. Аднак і гэтая прапанова была праігнаравана.

Няхай прабачыць мне начальнік упраўлення міністэрства У.К.Шчэрба, але яго паведамленне-адказ на маё пісьмо ўспрымаецца як бюракратычная адпіска чыноўніка. Тое ж самае можна сказаць і пра паведамленне спадара Шчэрбы аб прынятых мерах "Міністэрства адукацыі сумесна з Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама" па забеспячэнні функцыянавання новай установы адукацыі "Мінскі гуманітарны ліцэй" і што быццам бы былі "вызначаны ўмовы залічэння ў яго вучняў ліквідаванага ліцэя". А ісціна ў тым, што ніякага "Мінскага гуманітарнага ліцэя" створана не было. Доказам гэтага з'яўляецца і тое, што ніякай аб'явы на пачатку 2003—2004 навучальнага года і ў паміне не было аб наборы ў вышэй названы ліцэй. Таму гаварыць аб нежаданні значнай часткі бацькоў залічваць сваіх дзяцей у неіснуючы "Мінскі дзяржаўны гуманітарны ліцэй", мякка кажучы, непрыстойна.

Спадар Шчэрба наводзіць цень на пляцень і ў тым, калі імкнецца звязаць рашэнне Мінгарвыканкама "аб часовым размяшчэнні вучняў ліцэя ў іншых установах агульнай сярэдняй адукацыі г.Мінска" ... "з неабходнасцю правядзення капітальнага рамонту ў будынку, дзе размяшчаўся ліцэй". Але ж усім вядома, што размова пра рамонт будынка ліцэя — гэта фікцыя. Бо перш чым закрываць будынак на капітальны рамонт, праводзяцца даследчыя і праектныя работы і складаецца каштарыс. Аднак такой дакументацыі на час ліквідацыі ліцэя не існавала. Магчыма, яе не існуе яшчэ і зараз, бо ў хуткім часе споўніцца год з часу ліквідацыі ліцэя, а рамонт яго былога вучэбнага памяшкання яшчэ не пачынаўся.

Акрамя гэтага спадар У.Шчэрба, паведамляючы пра рашэнне Мінгарвыканкама "аб часовым размяшчэнні вучняў ліцэя ў іншых установах сярэдняй адукацыі г.Мінска", не гаворыць, што навучэнцаў ліквідаванага беларускамоўнага гуманітарнага ліцэя было вырашана накіраваць у рускамоўныя школы па месцы жыхарства. Ён абыходзіць маўчаннем той факт, што ліцэістаў пазбавілі магчымасці і законнага права вучыцца на роднай мове і ў любімых настаўнікаў. Менавіта з гэтым не пагадзіліся і іх бацькі. Таму бацькі неаднаразова — і вусна, і пісьмова — звярталіся ў міністэрства і ў Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама з просьбай дазволіць іх дзецям спакойна вучыцца, як і 12 гадоў таму, на роднай мове і ў сваіх выкладчыкаў. Але чыноўнікі гэтых устаноў засталіся глухімі і іх просьбы не пачулі.

Вось чаму на гэты раз я вырашыў звярнуцца да міністра адукацыі А.М.Радзькова праз паважаную "Народную волю". Буду спадзявацца, што шаноўны Аляксандр Міхайлавіч па-дзяржаўнаму, з гістарычнай адказнасцю падыдзе да разгляду адкрытага ліста, аб чым рэдакцыя зможа паведаміць шырокай грамадскасці.

ПУЛЬС

Не хапае лектараў па ідэалогіі...

Гомельская гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства "Веды" зведвае недахоп у лектарах па ідэалогіі. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН паведаміў супрацоўнік арганізацыі Сяргей Плешкуноў. Паводле яго слоў, патэнцыяльныя лектары не маюць жадання супрацоўнічаць, а кіраўнікі дзяржструктур не спяшаюцца заключаць дагаворы з арганізацыяй на чытанне лекцый, хоць мы прапаноўваем шырокі выбар тэм. Усяго толькі 10 працэнтаў прадпрыемстваў і ўстаноў Гомеля заключылі дагаворы аб супрацоўніцтве з арганізацыяй таварыства "Веды".

Марат ГАРАВЫ.

«Дзіцячае сэрца» — у Беларусі

Да 15 мая ў Беларусі будзе праходзіць традыцыйная дабрачынная акцыя "Дзіцячае сэрца". Яе арганізатарамі выступаюць Беларускі дзіцячы фонд (БДФ) сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі пры падтрымцы грамадскага аб'яднання "Мінскі ротары-клуб", прадстаўніцтва Ірландскай дабрачыннай арганізацыі "Chernobyl children's project" і міжнароднай дабрачыннай арганізацыі "Сафія".

У рамках акцыі беларускія спецыялісты сумесна з высокакваліфікаванымі спецыялістамі з Міжнароднай брыгады кардыёспецыялістаў на чале з доктарам Вільямам Новікам правядуць 25 складаных аперацый на адкрытым сэрцы дзецям-інвалідам з Беларусі з прыроджанымі парокамі сэрца.

Вольга АСІПЕНКА.

Павышаюцца мінімальныя і сацыяльныя віды пенсій

З 1 мая ў Беларусі павысіліся памеры мінімальных і сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў, што выплачваюцца да пенсій асобных катэгорый пенсіянераў.

Як паведаміла БелаПАН намеснік начальніка пенсійнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна Каралёва, такі пераразлік прадугледжваецца законам "Аб пенсійным забеспячэнні" ў мэтах падтрымання пакупной здольнасці пенсійных выплат у сувязі са змяненнем бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Пераразлік закране больш за 850 тысяч пенсіянераў, што складае каля 35 працэнтаў ад іх агульнай колькасці.

Вольга АСІПЕНКА.

У беспрацоўя жаночы твар

62 працэнты беспрацоўных, якія знаходзяцца на ўліку ў Наваполацкім гарадскім цэнтры занятасці насельніцтва, — жанчыны. А сярод беспрацоўных, якія знаходзяцца на ўліку больш за год, прадстаўніцы прыгожага полу складаюць 80 працэнтаў.

На думку спецыялістаў, гэтая сітуацыя склалася з-за монатворчай нафтахімічнай структуры эканомікі горада, пры якой асноўныя прадпрыемствы скіраваныя на выкарыстанне мужчынскай працоўнай сілы. Найбольш уразлівымі на рынку працы з'яўляюцца маці, якія выхоўваюць малых дзяцей, дзяцей-інвалідаў, работніцы перадпенсійнага веку, тыя, хто не мае прафесіі і вопыту працы.

Статыстыка сведчыць аб дыскрымінацыі жанчын пры прыёме на працу і звальненні. Так, у ліку тых, хто быў вызвалены з прадпрыемстваў горада з прычыны скарачэння штатаў і зарэгістраваўся ў цэнтры занятасці, доля жанчын перавышае 76 працэнтаў. Сярод беспрацоўных, звольненых паводле ўласнага жадання, іх 28 працэнтаў, сярод тых, хто страціў працу з-за парушэння працоўнай дысцыпліны, — толькі 10 працэнтаў.

Андрэй АЛЯКСАНДРАЎ.

«Святкаванне стагоддзя прафсаюзнага руху на дзяржаўным узроўні сведчыць аб залежнасці прафсаюзаў ад улад»

Такое меркаванне выказаў лідэр Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) Аляксандр Ярашук.

Нагадаем, што, выступаючы на ўрачыстай вечарыне з нагоды юбілею прафсаюзнага руху, Аляксандр Лукашэнка заявіў аб намеры ўлад і надалей аказваць падтрымку Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ). А 26 красавіка Лукашэнка выдаў указ аб заснаванні юбілейнага медаля "100 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі".

"Цяжка прывесці ў прыклад якую-небудзь іншую краіну (хіба што Паўночная Карэя і Куба), дзе прафсаюзны юбілей лічыцца амаль дзяржаўным святам, — сказаў А.Ярашук. — Сам факт таго, што з гэтай нагоды прымаецца ўказ прэзідэнта, гаворыць аб тым, што ні пра якую незалежнасць прафсаюзаў у Беларусі не можа быць і гаворкі. Прафсаюз — гэта абсалютна незалежная грамадская арганізацыя, якая дзейнічае паводле свайго статута, і сама можа і павінна выпускаць медалі, але ніяк не ўлада".

Ірына ЛЕЎШЫНА.

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

Американский заложник сам освободился из иракского плена

Гражданин США Томас Хэмилл, захваченный в заложники иракскими боевиками три недели назад, смог сам освободиться из плена. Как сообщает агентство Рейтер со ссылкой на информацию военного командования в Ираке, американский военный патруль обнаружил Хэмилла в окрестностях города Тикрит, примерно в ста милях от того места, где он был захвачен боевиками. "Он вышел из одного из зданий и представился военнослужащим", — сообщил журналистам бригадный генерал Марк Киммит. По словам генерала, Хэмилл был немедленно доставлен в один из госпиталей, где после осмотра врачи признали его состояние удовлетворительным.

43-летний водитель, работавший по контракту на компанию Kellogg, Brown & Root был взят в заложники 9 апреля, после того как колонна автомашин подверглась нападению неустановленных лиц.

Ариэль Шарон: «Наступают тяжелые времена»

Премьер-министр Израиля Ариэль Шарон заявил, что он очень опечален итогами референдума в партии "Ликуд" по вопросу одностороннего отделения Израиля от Палестинской автономии. Тем не менее Шарон отметил, что уважает выбор членов своей партии. По итогам внутрипартийного референдума, прошедшего в Израиле в воскресенье, 40 процентов членов "Ликуда" поддержали план Шарона об одностороннем отделении от ПА, соответственно 60 процентов голосовавших высказались против намерений израильского премьера. По данным партийного избиркома, явка по стране составила менее 40 процентов от 193 тысяч 190 зарегистрированных членов "Ликуда".

Тем не менее Ариэль Шарон заявил, что, несмотря на отсутствие поддержки со стороны членов партии, он не намерен подавать в отставку. "Я знаю, что большинство израильтян поддерживают мой план. И знаю, что они, как и я, огорчены результатами референдума. Наступают тяжелые времена, времена принятия трудных решений", — заявил израильский лидер. "Одно лишь ясно мне. Израильтяне выбрали меня не для того, чтобы я сидел сложа руки. Я был избран, чтобы принести спокойствие, безопасность и мир этой нации", — добавил Шарон.

В Вашингтоне избит судья Верховного суда США

Судья Верховного суда США Дэвид Соутер был избит во время вечерней пробежки около своего дома, расположенного недалеко от Капитолия. Судью избили несколько молодых людей, которым удалось скрыться с места происшествия. Соутер не был ограблен, подчеркнула Арберг. С незначительными повреждениями судья был доставлен в одну из вашингтонских больниц, откуда после врачебного осмотра был отправлен домой. Представители полицейского управления Вашингтона и персонал больницы отказались сообщить какие-либо подробности происшествия. Дэвид Соутер стал одним из девяти судей Верховного суда США в 1990 году.

Более 30 человек погибли при взрыве бензовоза в Афганистане

По меньшей мере 31 человек погиб и многие получили ранения в результате взрыва бензовоза на западе Афганистана. Взрыв произошел в городе Азизабад (провинция Герат). В результате взрыва также были разрушены несколько зданий. По информации местных властей, количество погибших может возрасти. Власти квалифицируют случившееся как несчастный случай. По одной из версий причиной взрыва стало дорожно-транспортное происшествие. По другим данным бензовоз взорвался в результате пожара в одном из магазинов, рядом с котором он был припаркован.

Чилийское кладбище предлагает клиентам гробы с датчиками движения

Бюро ритуальных услуг одного из кладбищ в столице Чили предлагает своим клиентам новую услугу — гробы, оборудованные датчиками движения. По словам представителей бюро ритуальных услуг кладбища Camino a Canaan в Сантьяго, датчики позволят полностью исключить вероятность того, что человек похоронен заживо. "Известны случаи, когда человек находился в состоянии каталепсии, оставался полностью парализованным в течение нескольких часов, и его хоронили заживо", — заявили они. "Родственники покойных могут быть уверены, что в таких случаях их близкие будут немедленно спасены".

Польский калейдоскоп

3 мая Польша отметила свой национальный праздник — День Конституции. В связи с этим публикуем подборку информации о жизни в соседней стране.

Торжества по случаю вступления в ЕС

В полночь 1 мая на всех радиостанциях и программах Польского радио прозвучали гимны Польши и Евросоюза. Польское радио, передавая "Мазурку Домбровского" и "Оду радости" Людвига ван Бетховена, таким образом отметило вхождение Польши в объединенную Европу.

Центральные торжества, посвященные вхождению в ЕС, с участием президента Александра Квасьневского, руководителей парламента прошли на площади Юзефа Пилсудского в Варшаве. В них участвовали тысячи жителей польской столицы. Прямую трансляцию вели общественное радио и телевидение. Торжественные концерты, богослужения и народные гулянья, приуроченные ко вступлению Польши в ЕС, прошли по всей Польше.

"Сегодня Польша возвращается в европейскую семью. Но двери Европейского Союза должны быть открыты для тех, чьи мечты и ожидания связаны с вхождением в ЕС", — заявил, выступая во время торжественной церемонии поднятия флага Евросоюза в центре столицы, президент А.Квасьневский. Он поблагодарил всех, кто своими действиями способствовал вступлению Польши в ЕС. Среди наиболее заслуженных глава государства назвал Папу Римского Иоанна Павла второго и бывшего президента Польши Леха Валенсу. А.Квасьневский также подчеркнул, что это историческое событие позволит распространить стабильность и процветание нынешнего ЕС на другие страны континента, создать новые рабочие места, ускорить экономический рост и предоставит Европе большие возможности для влияния на мировой политической арене.

Европейский Союз и восточные соседи

По мнению президента Александра Квасьневского, вступление Польши в Евросоюз не ухудшит ее отношений с Россией и другими восточными соседями. Беседу с Александром Квасьневским опубликовала "Российская газета". Членство в ЕС не должно вести к созданию нового "железного занавеса", утверждает польский президент. По его мнению, отгораживание от Беларуси, Украины и России было бы губительным для Польши. "Поэтому мы так старались, чтобы через наши восточные границы проходил нормальный обмен людьми и товарами", — сказал президент Польши.

Экономика на подъеме

Экономика Польши находится на подъеме. Рост ВВП этой страны составит в нынешнем году предположительно 4% против 3,7% в минувшем году, сообщает радио "Немецкая волна". Таков прогноз берлинского Института экономических исследований, составленный им совместно с Центром социально-экономических исследований в Варшаве. Оживление в народном хозяйстве Польши объясняется главным образом двумя обстоятельствами: успехами экспорта и растущим индивидуальным потреблением. А вот инвестиционная активность пока растет медленно.

А Польское радио передает, что, представляя в Сейме информацию о состоянии государственных финансов, глава правительства объявил об улучшении показателей и о том, что нет никаких сигналов, предвещающих резкий рост цен в связи со вступлением страны в Европейский Союз.

Злотый на евро

Польша может перейти на евро уже в 2007 году. Об этом заявил председатель Народного банка страны Лешек Бальцерович, выступая на пленарном заседании Европейского экономического форума в Варшаве.

По его мнению, в Польше нет экономических препятствий для того, чтобы ввести в стране общеевропейскую валюту и уже с 2007 года поляки могли бы пользоваться европейскими деньгами. Однако председатель Народного банка Польши полагает, что несмотря на отсутствие экономических проблем, теоретически могут возникнуть политические препятствия для перехода на евро.

Польские аналитики отмечают, что досрочные выборы и приход к власти радикальных политиков могли бы привести к замедлению экономического развития и росту безработицы. В такой ситуации перспективы введения евро были бы крайне туманны.

Сокращается зона в Ираке

Американские военные взяли под свой контроль иракские провинции, где безопасность обеспечивали испанские миротворцы. Под их контроль переходят провинции Наджаф и Кадисия. Таким образом, под ответственностью международного контингента под польским командованием остались три провинции из пяти.

Поляки будут получать пенсии в странах ЕС.

«Вышеградские» деньги на культуру

Министры культуры Польши, Чехии, Словакии и Венгрии приняли в Кракове решение о создании Вышеградского фонда по делам культуры, который поддержит, в частности, создание издательской серии "Вышеградская библиотека". Эти страны неформального политического союза, называемого "вышеградской группой", решили, передает Польское радио, что новый фонд будет изначально располагать средствами в размере 400 тысяч евро, переданных из бюджетов министерств культуры четырех государств. Эти средства послужат совместному финансированию самых интересных художественных и культурных проектов. Первым таким проектом является словацкая инициатива создания серии "Вышеградская библиотека", в которую войдут лучшие книги польских, словацких, чешских и венгерских авторов, а также их параллельные переводы на три языка. Таким образом в течение нескольких лет будет издана серия произведений художественной и общественной литературы четырех стран.

Подготовил к печати Иван МАКАЛОВИЧ.

Палітыкі каменціруюць рэзалюцыю ПАСЕ па Беларусі

Мікалай СТАТКЕВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (НГ):

— Я б не раіў у найбліжэйшы час спадару Лукашэнку выязджаць на гарналыжныя курорты ў Аўстрыю, а спадару Сівакову (міністр спорту і турызму, а раней кіраўнік МУС. — **БелаПАН**) ні ў якім выпадку не варта ехаць на Алімпіяду ў Афіны, таму што можа знайсціся нейкі пракурор, напрыклад, іспанскі, які выпіша ордэр на яго арышт".

Я заклікаю беларускія ўлады адумацца і выканаць рэкамендацыі ПАСЕ, хаця б дзеля будучыні беларускага народа.

Сяргей КАЛЯКІН, лідэр Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ):

— Цяперашнія беларускія ўлады ўсё больш і больш заводзяць краіну ў ізаляцыю.

Згодна з прынятым у Страсбургу дакументам, Парламенцкая асамблея лічыць немэтазгодным мець нейкія кантакты з афіцыйнымі ўладамі Беларусі, а таксама ўдзел краіны ў міжнародных пагадненнях і канвенцыях датуль, пакуль не будзе зроблены істотны прагрэс у расследаванні знікненняў вядомых людзей, не будзе адхілены ад пасады генеральны пракурор Віктар Шэйман і не будуць пакараны вінаватыя ў гэтых злачынствах.

Акрамя таго, ПАСЕ заклікала ўрады тых краін, чые законы дазваляюць расследаваць і праводзіць судовыя працэдуры ў дачыненні да злачынстваў, не ўчыненых на іх тэрыторыях (такой краінай, напрыклад, з'яўляецца Іспанія), скарыстаць гэтае права для "ўзбуджэння крымінальных спраў супраць некаторых высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў у сувязі з так званымі забойствамі па палітычных прычынах аднаго (або больш) з чатырох зніклых чалавек".

Шанцы дэмакратычных сіл на выбарах рэальныя, мяркуе Алег Манаеў

Вынікі апошніх даследаванняў Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) паказваюць, што шанцы дэмакратычных сіл на поспех у восеньскіх парламенцкіх выбарах рэальныя пры выкананні шэрагу рэкамендацый інстытута. Аб гэтым заявіў дырэктар НІСЭПД Алег Манаеў, выступаючы ў Мінску на пасяджэнні славацка-беларускага "круглага стала" "Роля аналітычных цэнтраў у палітычным працэсе".

Дзеля таго каб павялічыць электарат дэмакратычных сіл, А.Манаеў прапануе некалькі спосабаў. Першы, найпрацейшы і тактычна найэфектыўнейшы, — прыцягнуць на свой бок 23,8 працэнта выбаршчыкаў, гатовых галасаваць за незалежных кандыдатаў, і ўключыць гэтых кандыдатаў у свае спісы альбо пазіцыянаваць у якасці незалежных сваіх кандыдатаў.

Другі спосаб пашырэння дэмакратычнага электарату, больш складаны, але больш эфектыўны, стратэгічны, — гэта прыцягненне на свой бок выбаршчыкаў, якія вырашылі не ісці на выбары. Колькасць "ухіленцаў", паводле ацэнак НІСЭПД, складае 35,8 працэнта (больш за 2,6 млн. выбаршчыкаў). Гэта "надзвычай важны патэнцыяльны рэсурс дэмакратыі", лічыць А.Манаеў.

Сёння, паводле слоў дырэктара інстытута, большая частка беларусаў, крытычна настроеная да цяперашняга курсу, скептычна ацэньвае саму магчымасць яго змены праз якія б там ні былі выбары. Так, амаль 70 працэнтаў "ухіленцаў" не задаволены развіццём дэмакратыі ў Беларусі. З іх амаль дзве траціны не вераць, што выбары ў Нацыянальны сход будуць свабоднымі і справядлівымі.

Лавінія АРЭШКА.

«Беларускі народ не нясе адказнасці за дзеянні кіраўнікоў, якія выклікаюць алергію ў Савеце Еўропы»

Такую думку выказаў дэпутат Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы ад Расіі **Леанід СЛУЦКІ**.

"Нельга ізаляваць Беларусь і весці кантакты па тэлефоне незразумела з кім. Трэба кантактаваць з беларускімі ўладамі, з парламентам, сустракаючыся з імі тут, у Страсбургу. Для гэтага неабходна знайсці форму працы, якая адпавядае рэгламенту Савета Еўропы. І мы не павінны трымаць гэтую краіну на дыстанцыі, якімі б вялікімі ні былі прэтэнзіі Савета Еўропы да Беларусі. У наяўнасці воля беларускіх парламентарыяў працаваць з Саветам Еўропы, і, безумоўна, мы павінны знайсці такі фармат, які дазволіць прайсці няхай доўгі, але цалкам неабходны шлях да ўступлення Беларусі ў Савет Еўропы", — заявіў Л.Слуцкі.

Пасля маючага адбыцца ўступлення ў Савет Еўропы Княства Манака Беларусь застанецца адзінай краінай на кантыненце, якая не з'яўляецца членам гэтай арганізацыі.

Марына ІРХО.

Браты Гарэцкія жылі дзеля Беларусі

4 мая ў Мінску адбудзецца канферэнцыя "XII Гарэцкія чытанні".

Арганізатары канферэнцыі па тэме **"Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць"** — Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы, Інстытут геалагічных навук НАН Беларусі.

У чытаннях возьмуць удзел літаратуразнаўцы, лінгвісты, педагогі, геолагі, якія даследуюць творчую і навуковую спадчыну выдатных сыноў Беларусі з роду Гарэцкіх — класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага і акадэміка, геолага Гаўрылы Гарэцкага.

Сярод шаноўных гасцей канферэнцыі чакаецца народны пісьменнік Беларусі **Янка Брыль,** народны паэт Беларусі **Ніл Гілевіч,** старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў **Алесь Пашкевіч,** прадстаўнік Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь **Тадэвуш Стружэцкі.**

Праца XII Гарэцкіх чытанняў пачнецца **4 мая ў 10 гадзін у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры** (вул.М.Багдановіча, 15, Траецкае прадмесце).

Рэгістрацыя ўдзельнікаў з **9.00 да 9.50.**

Тэлефон для даведак: **289-34-75** (Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры).

Аргкамітэт.

Вёскі сыходзяць у нябыт

Усё больш вёсак Віцебшчыны паглынаецца гарадамі, якія хутка растуць. У бліжэйшы час з карты Віцебскага раёна знікнуць старадаўнія і прыгожыя вёскі Біцялёва і Арэхава, якія, згодна з рашэннем абласнога Савета дэпутатаў, будуць уключаны ў межы Віцебска.

Такі ж лёс неўзабаве чакае Паўлавічы, Баронікі, Шульцава і Янапаль.

Тым жа рашэннем пашыраюцца межы раённага цэнтра Лепель. Да тэрыторыі гэтага горада будуць далучаны вёскі Беляніца, Зялёнка, Забаенне і Жарцы.

З аднаго боку, працэс уваходжання вёсак у гарады натуральны і непазбежны. Але з другога боку — варта ўслухацца ў мілагучныя, гістарычна абумоўленыя, а нярэдка і праслаўленыя назвы населеных пунктаў, якім наканавана знікнуць і якіх ужо ніколі не будзе чутно на зямлі.

Добра, калі мясцовым уладам хопіць розуму захаваць зніклыя імёны ў назвах мікраараёнаў і вуліц.

А калі ніхто да гэтага не дадумаецца, звесткі пра Біцялёва, Баронікі, Зялёнку і Забаенне нашчадкам іх цяперашніх старажылаў прыйдзецца пільна шукаць у архівах, музеях і энцыклапедычных даведніках.

Добра, калі б краязнаўцы Віцебска і Лепеля запісалі, пакуль не позна, успаміны самых старых і паважаных жыхароў вёсак, прыгавораных да шляху ў нябыт...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

«Крама» збірае аматараў блюза

7 мая адбудзецца акустычны канцэрт знакамітага беларускага гурта "Крама".

На канцэрце будуць гучаць як вядомыя хіты кіраўніка гурта ***Ігара ВАРАШКЕВІЧА*** , так і песні з іх новага альбому *"Mein Vaterland, Auf Wiedersehen",* які прысвечаны развітанню з рамантычным перыядам у творчасці гурта "Крама". Разам з "крамаўцамі" на сцэну выйдуць таксама некаторыя вядомыя беларускія музыкі.

Дарэчы, гэты год абяцае быць вельмі плённым для аматараў творчасці "Крамы". Разам з *БМА group* музыкі рыхтуюць ліцэнзійнае перавыданне дыска "Гарэлка на лёдзе" ў арыгінальным афармленні, які выйшаў у Вялікабрытаніі ў 1993 годзе. Акрамя гэтага, прыхільнікаў творчасці Ігара Варашкевіча чакае яшчэ адзін сюрпрыз: у рамках святкавання года блюза, які аб'яўлены сёлета ЮНЭСКА, рыхтуецца да выхаду канцэртны альбом "Крамы" — "Жывы канцэрт "Навапалацк'96".

Анатоль МЯЛЬГУЙ.

ЭКСКЛЮЗИВ

«Ведь если мы желаем войти в клуб, мы обязаны соблюдать правила, установленные для всех его членов...»

